**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у красавіку**

У рамках святкавання **80-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў** ДУК “Лунінецкая РЦБС” з 1 мая па 30 чэрвеня запусціла анлайн-конкурс чытальнікаў “О Родине, о мужестве, о славе”. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна запісаць відэаролік выканання верша, апавядання, адрыўка з паэтычнага ці празаічнага твору, прысвечанага тэме Вялікай Айчыннай вайны, і даслаць у раённую бібліятэку. Усе відэазапісы будуць размешчаны на старонках у сацыяльных сетках Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.**

**2 красавіка. ЦБ.** У бібліятэцы адбыўся адкрыты дыялог “Дружба без границ”. Перад вучнямі СШ №1 выступіла адвакат юрыдычнай кансультацыі Тамара Аляксееўна Грыцкевіч, якая падрабязна расказала аб узаемадзеянні і партнёрстве адвакатаў Беларусі і Расіі, абароне правоў і інтарэсаў давернікаў на прасторы Саюзнай дзяржавы. Далей выступіў старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі лакаматыўнага дэпо Лунінец Аляксандр Іванавіч Матор, які расказаў аб супрацоўніцтве чыгункі Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй.

**2 красавіка. ЦДБ**. Адбыўся відэалекторый “Дзве сястры – Беларусь і Расія” з абмеркаваннем роліка. Таксама бібліятэкары расказалі дзецям аб стварэнні супольнасці Беларусі і Расіі, падпісанні Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, аб дзяржаўных сімвалах, літаратуры, славутасцях, культурных традыцыях, якія садзейнічалі развіццю сяброўскіх адносін паміж дзвюма дзяржавамі.

**2 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Для вучняў 1 “А” класа СШ №2 прайшла літаратурна-пазнавальная праграмма “Две сестры – Беларусь и Россия”. Бібліятэкар расказала аб супрацоўніцтве Беларусі і Расіі, пазнаёміла са слайд-прэзентацыяй “День Единства”. А для замацавання атрыманых ведаў дзецям прапанавалі сабраць пазлы-карцінкі.

Да **Дня здароўя** у бібліятэках прайшлі акцыі, пазнавальныя гадзіны, урокі здароўя па прапагандзе здаровага ладу жыцця.

**5 красавіка. ЦБ.** У чытальнай зале бібліятэкі для інвалідаў адзялення дзённага знаходжання Лунінецкага ТЦСАН правялі пазнавальны квэст “Ежа для здароўя”. Прысутным расказалі пра асновы здаровага ладу жыцця, прапанавалі паўдзельнічаць у фізкультхвілінцы, конкурсах, віктарыне пра здаровую і  карысную ежу. У завяршэнні квэста ўдзельнікі атрымалі смачны падарунак - “кошык здароўя”.

**Мікашэвіцкая г.б.** Супрацоўнікі бібліятэкі правялі для сваіх чытачоў цыкл мерапрыемстваў “Дзень здароўя ў бібліятэцы”. Так, **4 красавіка** адбылася гадзіна інфармацыі “Азбука здоровья” для чытачоў-пенсіянераў. У ходзе гутаркі разабралі паняцці здаровага ладу жыцця і правільнае харчаванне, пагаварылі аб рацыёне і аб важнасці захавання рэжыму харчавання, разыгралі бяспройгрышную жартоўную латарэю.

**5 красавіка** для вучняў 8 “Б” класа СШ №2 правялі пазнавальную гадзіну “Подари себе здоровье”. Бібліятэкар пазнаёміла ўдзельнікаў мерапрыемства з кніжнай выставай “Беражыце здароўе” і дала парады, якія дапамогуць застацца здаровымі на працягу жыцця. Юныя госці адгадвалі словы-анаграмы “Наступствы курэння”, адказвалі на пытанні бліц-турніру.
Для вучняў 2 “В” і 1 “Б” класаў СШ №2 правялі гульню-віктарыну “В гостях у Мойдодыра”. Дзецям расказалі аб правілах асабістай гігіены, здаровага харчавання, загартоўвання. Усе актыўна прымалі ўдзел у конкурсах і слухалі парады літаратурных персанажаў.
**5 красавіка. ЦДБ.** Для вучняў пачатковых класаў у сярэдняй школе №1 супрацоўнікі бібліятэкі правялі Дзень здароўя “Витаминкины секреты”. Вучні выконвалі спартыўныя заданні, адказвалі на пытанні, адгадвалі загадкі.

У бібліятэках Лунінецкай РЦБС прайшлі акцыі, вечары памяці, аформлены кніжныя выставы, прысвечаныя **Міжнароднаму дню вызвалення вязней фашысцкіх канцлагераў.**
**11 красавіка. ЦБ.** Вечар памяці «И помнить страшно, и забыть нельзя» адбыўся для вучняў 9 “А” класа СШ №3. На мерапрыемства запрасілі Івана Іванавіча Рудовіча, вязня канцлагера, Таццяну Васільеўну Канапацкую, журналіста і краязнаўцу, Вераніку Анатольеўну Чарнавокую, памочніка пракурора. Галоўны бібліятэкар расказала пра страшныя падзеі ваенных гадоў, зверствы фашызму ў гады вайны. Школьнікі пачулі статыстыку чалавечых ахвяр ад Веранікі Анатольеўны. Пра самыя жорсткія лагеры смерці расказала Таццяна Васільеўна. Перад моладдзю выступіў Іван Іванавіч, які са слязамі на вачах расказаў, як даводзілася яго сям’і выжываць ва ўмовах выпрабаванняў канцлагера.
**11 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Для вучняў 8 “В” класа СШ №2 і вучняў 9 “Б” класа СШ №1 правялі ўрок мужнасці “Между жизнью и смертью”. Рабяты пачулі пра такія лагеры як: Бухенвальд, Асвенцым, Трасцянец, Азарычы, Чырвоны бераг. Успомнілі аб тым, што ў Лунінецкім раёне было створана некалькі гета.
Супрацоўнікі бібліятэкі наведалі на даму малалетнюю вязніцу канцлагера, актыўную чытачку бібліятэкі Крысціну Чаславаўну Палессу, якая знаходзілася ў канцлагеры Фласэнбюрг. Яна падзялілася ўспамінамі аб сваім жыцці.
**11 красавіка. ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі арганізавалі для маленькіх чытачоў Дзень памяці “Трагедия детских концлагерей”. Дзецям расказалі пра зверствы фашызму і чалавечыя ахвяры ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пазнаёмілі прысутных з кніжнай выставай “Дзеці і вайна”.
Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, бібліятэкар **Лобчанскай с.б.** наведала на даму вязніцу Агафью Данілаўну Корчык. У **Любанскай с.б.** прайшла гадзіна патрыятызму “Міхаіл Савіцкі. Спадчына”. У **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла гадзіна памяці “Пока мы живы – помнить надо!” і інш.

У **Мікашэвіцкай г.б**. арганізавалі цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных **Дню касманаўтыкі. 10 красавіка** для ўдзельнікаў клуба маладых інвалідаў “САМИ” правялі пазнавальную гутарку “Беларускія касманаўты”. **12**

**красавіка** для вучняў 7 "В" класа СШ №1 правялі касмічны квэст "Дорога во Вселенную". А для вучняў 2 "В" класа СШ №2 правялі пазнавальную гадзіну "В гостях у Звездочёта".

**17 красавіка. ЦБ.** У актавай зале бібліятэкі адбыўся юбілейны творчы вечар «На блакітных крылах Касмеі» паэта, члена народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Литературная провинция" Вольгі Грыдзюшка.

Прайшлі ў бібліятэках мерапрыемствы да **Міжнароднага дню помнікаў і гістарычных мясцін.**

**18 красавіка. ЦБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі правялі гістарычны экскурс «Памятники и исторические места нашего города» і разам з навучэнцамі СШ №1 і кіраўніком патрыятычнага выхавання Мікалаем Іванавічам Вячорка наведалі памятнікі горада Лунінца і даведаліся аб гісторыі іх ўзнікнення.

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Рэдзігераўскай с.б.** была арганізавана экскурсія "Незабываемые места малой родины" па памятных месцах аграгарадка. **Вулькаўская -1** с.б. арганізавала культпаход «Милая малая родина». **Дрэбская сельская бібліятэка-клуб** – завочную вандроўку з прэзентацыяй "Самые необычные памятники Беларуси".

Прайшлі мерапроыемствы да **Дня Чарнобыльскай трагадыі.**

**26 красавіка. ЦБ.** Адбылася эколага-пазнавальная гадзіна "Уроки Чернобыля" для вучняў 9 "Б" класа СШ №1. Вядучыя прасачылі храналогію падзей таго страшнага дня. У мерапрыемстве ўдзельнічаў ліквідатар наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС Андрэй Іванавіч Кіндрук. Ён расказаў пра гераічную барацьбу ліквідатараў аварыі. Таксама на мерапрыемстве прысутнічала участковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Карына Мікалаеўна Лукашэвіч.

**26 красавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшоў урок-разважанне "Чарнобыль у памяці і кнігах". Вучні 9 "В" класа паглядзелі відэаролік аб аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з беларускімі паэтамі і пісьменнікамі, якія прысвяцілі свае творы Чарнобыльскай трагадыі. Удзельніца клуба "Паэтычная глыбінка" Алена Адамаўна Кудач прачытала вершы А.Пісьмянкова, Н.Мятліцкага, А.Грачанікава.